4 Книжный плей-лист // www.nlb.by URL: https: //www.nlb.by/ content/ news/ library-news/ knizhnyy-pley-list_269825 / (дата обращения: 23.03.2019).

## *Ралейник К., Дождзікава Р.Н.* Мая малая Радзіма

Жывём мы на гэтай чароўнай, багатай зямлі і за штодзённымі клопатамі не заўважаем яе хараства, прывыкаем да ўсёй гэтай прыгажосці. І па-сапраўднаму адчуваем Радзіму толькі ўдалечыні ад яе. Як хочацца тады пачуць гучанне роднай мовы, убачыць роднае неба, удыхнуць роднага паветра. Нашы Гудзевічы – цудоўны куточак прынёманскага краю, вёска, якую добра ведаюць не толькі на Мастоўшчыне, на Гродзеншчыне, але і ў многіх іншых месцах Беларусі і далёка за яе межамі.

Дакладна вядома, што ўжо ў 1539 годзе нашы Гудзевічы былі здаўна вядомым населеным пунктам. Пра гэта сведчыць Грамата, арыгінал якой захоўваецца ў Варшаўскім універсітэце: «Мы, князь Павел Кежан з ласкі Божай Віленскі епіскап, адзначаем гэтым нашым лістом, што царкву Святой Прачыстай у нашым панстве ў Гудзевічах … з належачымі да яе здаўна землямі, сенажацямі, лясамі, гаямі, дубровамі, з рэкамі і з усімі даходамі і вольнасцямі, якімі здаўна яна карысталася … Іосіфу Пятровічу, яго жонцы і сынам далі на вечнасць, а ён згодна з абавязкам сваім павінен служыць божую службу і пастаянна маліцца перад Госпадам Богам за здароўе караля яго міласці, як і належыць кожнаму багамольцу. Гэты ліст пад пячаткаю нашаю далі. Пісаны ў Вільні 4 ліпеня 1539 года» [1, с. 132]. Калі ж спасылацца на семантыку назвы вёскі, то час яе ўзнікнення яшчэ больш далёкі, бо назва Гудзевічы паходзіць ад слова гудас, так яцвягі, якія тут жылі, называлі славян, што пасяліліся ў нашых краях у X-XI стагоддзях, і канчаткова асіміляваліся, растварыліся сярод славян у XIII стагоддзі [2, с. 12].

Наша царква, гісторыя якой непарыўна звязана з гісторыяй вёскі, – сведка многіх падзей. «О том, кто был основателем-фундатором Гудевичской Церкви, церковные документы говорят различно: например, в передаче Церкви Священнику Иоанну Гошалицкому 27 ноября 1733 года, … в визите Благочинного Священника Казимира Давидовича от 29 мая 1778 говорится, что Гудевичская

Церковь основана Святейшими Королями Польскими» – знапісана ў царкоўна-прыходскім летапісе, які ў 1884 годзе склаў святар Міхаіл Львовіч Кузьмінскі. Такім чынам Гудзевіцкі прыход утварыўся не пазней пачатку пятнаццатага стагоддзя. У царкоўным архіве захоўваліся візітныя запісы, у якіх упамінаецца пра два драўляныя храмы. У 1852 годзе на сродкі прыхаджан пабудавана чатырохвугольная прадаўгаватая царква, якая, праіснаваўшы 25 гадоў запатрабавала капітальнай перабудовы. Вясною 1877 года былі сабраны сродкі на абнаўленне царквы і пад кіраўніцтвам Протаіерэя Віктара Абрамовіча, які ў той час быў настаяцелем, пачаліся работы па перабудове і былі скончаны 8 верасня 1877 года. Адноўленая царква была асвечана ў імя нараджэння Прасвятой Багародзіцы. У 1909 годзе прыхаджане добраахвотна ўзяліся за пашырэнне храма. У 1913 годзе замест драўлянай падлогі ўкладзена тэрракотавая плітка. З таго часу да нашых дзён Царква не перабудоўвалася, службы ў ёй ішлі ўвесь час, яна ніколі не зачынялася і заўсёды падтрымлівалася і падтрымліваецца ў добрым стане. Зараз настаяцелям царквы з'яўляецца протаіерэй Мікалай Сень, які ўжо больш за тры дзясятка гадоў свайго жыцця прысвяціў прыходу Гудзевіцкай царквы Нараджэння Прасвятой Багародзіцы.

Ёсць некалькі легенд, звязаных з узнікненнем назвы паселішча. У кнізе «Легенды і паданні Гродзеншчыны» расказваецца, што ў гэтай мясцовасці жыла прыгожая дзяўчына Гудзя. Палюбіла яна прыгожага хлопца з багатай сям'і як і ён яе. Але шчасцю маладых не суджана было збыцца, бацькі хлопца не далі згоды на шлюб. Дзяўчына загінула.У памяць аб ёй і назвалі паселішча» [3, с. 143].

Але больш верагодным і навуковым лічыцца паходжанне назвы ад балцкага слова гудас што значыць беларус. Гудасамі балты-яцвягі, што жылі калісьці ў нашай мясцовасці, называлі славян. Многія паселішчы маюць балцкія карані, такія, напрыклад, як Лунна, Індура і іншыя. Нам падабаюцца ўсе паданні пра нашу мясцовасць. Найбольшую ж вядомасць Гудзевічам прынёс мясцовы музей – зараз установа культуры Гудзевіцкі дзяржаўны літаратурна-краязнаўчы музей. Гудзевіцкі дзяржаўны літаратурна-краязнаўчы музей з'яўляецца адзіным у Беларусі музеем такога ўзроўню ў сельскай мясцовасці, з унікальнымі арыгінальнымі экспанатамі, якія маюць вялікую каштоўнасць не толькі для дадзенага рэгіёну, але і для культурнай спадчыны рэспублікі.

Разнастайнасць тэматычнай структуры экспазіцыі музея прываблівае экскурсантаў не толькі з розных куткоў Беларусі, але і з блізкага, і з далёкага замежжа. Музей вядомы і карыстаецца аўтарытэтам у навуковых колах сярод тых, хто вывучае літаратурную, этнаграфічную, культурную спадчыну нашага народа. Адчынены музей ў 1968 годзе на грамадскіх пачатках настаўнікам беларускай мовы і літаратуры Белакозам Алесем Мікалаевічам пры Гудзевіцкай СШ. Першапачаткова ён размяшчаўся ў адным пакойчыку, але колькасць матэрыялаў з кожным днём павялічвалася. Дзеці вялі актыўную перапіску з пісьменнікамі, літаратуразнаўцамі, мастакамі, таму неўзабаве стала цесна [4]. Якраз тады наведаў школьны музей Міхаіл Сцяпанавіч Пронька – старшыня калгаса імя Карбышава (зараз ЗАТ Гудзевічы), на тэрыторыі якога размешчана наша вёска. З таго дня старшыня калгаса стаў адным з самых актыўных стваральнікаў музея. Расказваць пра багацце, сабранае ў нашым музеі можна бясконца доўга. Пра гэта многа пісалі ў друку, расказвалі па радыё і тэлебачанні. Але, як кажуць у народзе, лепш адзін раз убачыць, чым многа разоў пачуць.

Літаратура

1. Пархута, Я.С. Зямля бацькоў нашых / Я.С. Пархута. – Мінск, 1988.
2. Зелянкова, М.А. Белая Русь: Гісторыя Беларусі ў легендах і паданнях / М.А. Зелянкова. – Мінск, 1999.
3. Ненадаўца, А.М. Гродзеншчына ў легендах і паданнях / А.М. Ненадаўца. – Мінск, 1999.
4. Нашы Гудзевічы (официальный сайт государственного літературно-краеведческого музея). [Электронный ресурс]. Режим доступа: http://gudevichi-muzey.narod.ru/ –23.03.2019.

***Рагойша С.М, Булыго Е.К.*** **Роль культурного и исторического аспекта в самоидентификации белорусского народа в условиях роста глобализационных рисков**

Процесс глобализации в последние десятилетия затронул самые разные сферы человеческого бытия. Безусловно, сегодня мы можем говорить не только об экономической глобализации, но и глобализации культурной, которая имеет свои особенности и динамику.